# КОЛА ВЯСНОВЫХ ГУЛЬНЯЎ

**Мэта:** стварыць умовы для знаёмства вучняў у гульнёвай форме з абрадамі, святамі, павер'ямі, прыкметамі беларускага народа.

**Задачы:**

- азнаямленне вучняў з народнымі гульнямі, правіламі іх правядзення;
- развіццё цікавасці да нацыянальнай культуры, агульнага кругагляду;
- выхаванне любові і павагі да культуры сваёй краіны і яе народа.

**Дзеючыя асобы:**

- вядучая - Багіня вясны, жыцця і часу Жыва, апранутая ў касцюм з белай тканіны і ільну;
- дзве дзяўчынкі, апранутыя ў сукенкі з лёгкай тканіны бела-блакітнага і чырвона-жоўтага колеру (выконваюць танец зімы і лета);
- дзве дзяўчынкі-вяснянкі, апранутыя ў касцюмы з белай тканіны і ільну, на галовах вяночак з саламяных кветак альбо з зялёных лістоў;
- дзяўчына-вясна, апранутая ў сукенку з лёгкай тканіны зялёнага колеру, на галаве вянок з **зялёных** галінак.

**Абсталяванне:**

- дрэва з папяровымі і саламянымі птушкамі ці круцёлка, упрыгожаная птушкамі, галінкамі вярбы, яйкамі;
- эмблема свята "Сонейка і птушачкі";
- магнітафон;
- прызы-падарункі саламяныя і папяровыя птушкі, саламяныя званочкі і дудачкі-свістулькі, цукеркі-ледзяшы.

**Аўдыёзапісы:** "Гукі прыроды. Вясна", танцавальная беларуская народная музыка.

**Прадметы, неабходныя для праведзення гульні:**

- драўляныя палачкі (кавалкі галінак дрэў) - 40 шт.;
- ніткі даўжынёй 15 см.- 40 шт.;
- галінкі вербачкі альбо івы – 20 шт.;
- пер'е – 10 шт.;
- 4 шклянкі;
- 2-4 аднаразовыя шклянкі;
- маркеры - 2 шт.;
- лісты паперы фармат А4 – 2 шт.;
- птушачкі-печыва – 16 шт.;
- 2 абручы;
- 4 скакалкі;
- саламяны капялюш або хустка для дзеда і бабы;
- вада – 0,5л;
- кавалак крэйды – 1 шт.;
- паветраныя шарыкі - 20 шт.;
- караблікі з паперы - 6 шт.

## Ход мерапрыемства

*Гучыць музыка - спевы птушак. У залу ўваходзіць вядучая - багіня Жыва са сваімі памочніцамі і спявае.*

Ды ўжо ж вясна на калочку,
Не напрала на сарочку. Гу...

**Вядучая.**

Ой, вясна-маці,

Хадзі да нас гуляці!

Хадзі да нас гуляці,

Карагод спраўляці!

Добры дзень, добрым людзям!

Добраму - дабра, добра – добраму!

Мне вельмі прыемна вас вітаць на нашым свяце, дзе мы ўсе разам сабраліся, каб паспяваць, гуляць і добра адпачыць, а потым доўга-доўга ўспамінаць. Сёння мы з вамі правядзём вясновыя гульні, навучымся вясну сустракаць, зямлю-матухну адмыкаць, птушачкамі спяваць.

*Гучыць раскат грому ў запісе*

**Вядучая.** А што гэта за гром? Так, разумею, гэта зіма з вясною сустрэліся.

*Выконваецца танец дзвюх дзяўчынак, якія сімвалізуюць зіму і вясну.*

**Вядучая.** Гэта свята Стрэчанне Гасподне, або Грамніцы, зімовае свята язычніцкага паходжання, якое ў народным календары прыпадае на 2-га лютага ў каталікаў і 15-га лютага ў праваслаўных беларусаў. У гэты дзень у старажытныя часы славяне-язычнікі ўшаноўвалі Бога Перуна, або Грамоўніка, які зганяў з зямлі злых духаў сваімі агнявымі стрэламі. Так і мы з вамі будзем спаборнічаць, зганяць злых духаў з зямлі. За перамогу атрымлівае жэтон.

Для гульні фарміруюцца дзве каманды.

**Гульня 1**

*Дзве дзяўчынкі-памочніцы на падносах выносяць трэсачкі, ніткі, пер'е, караблікі і раздаюць іх абедзвюм камандам, толькі караблікі пакідаюць на першых трох радах*

**Вядучая.** Уявіце сабе такую карціну: зіма з вясною змагаюцца, свішча вецер, падае апошні снег, дрэвы хістаюцца, а тут яшчэ аднекуль гракі прыляцелі. Я думаю, што ўсе бачылі карціну мастака Саўрасава "Гракі прыляцелі"? Ганцоў вясны ўбачыў у іх мастак. Дык вось для гульні нам спатрэбіцца па тры дзяўчынкі з кожнай каманды, якія будуць выконваць ролю бярозак, гракі-усе, хто прысутнічае ў гэтай зале, два хлопчыкі, адзін дзед ці баба.

Спачатку свішча вецер - адна каманда дзьме на другую, пры гэтым яна падкідвае ў паветра пер'е і дзьме на іх, а другая ў гэты момант падымае рукі ўгору і выконвае ролю дрэў, якія хістаюцца ад ветру. Па майму сігналу каманды мяняюцца ролямі, а суддзі сочаць за тым, якая каманда больш актыўная.

Цяпер падняліся бярозкі з месца, рукі паднялі ўгору і калыхаюць імі, а астатнія ўсе ўявілі, што ляцяць гракі, гракам (гледачам) трэба пракрычаць: КЫРР-КЫРР-КЫРР... Тут з'яўляюцца два хлопцы (па аднаму з кожнай каманды) і страляюць у паветра (лопаюць паветраныя шары). Гракі разлятаюцца і крычаць яшчэ мацней... З'яўляецца дзед ці бабулька і кулакамі пагражае: “Ах,я вас!”

*Журы вызначае лепшую каманду.*

**Вядучая.** Існавала раней такая прыкмета ў беларускага народа: калі прылятаюць гракі і адразу на гнёзды садзяцца, вясна будзе дружнай.

Я думаю, што ад такога крыку вясна сапраўды да нас прыйшла б раней. Ну а зараз нам трэба ўсім разам праспяваць песеньку-вяснянку " Жавароначкі прыляціце".

Жавароначкі,прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку прыбярыце,

Бо зімачка надаела,
Нам хлебчыкі пераела.
Жавароначкі,прыляціце,
Зямлю-матухну абудзіце,
Дожджыкам напаіце,
Каб травачкі нарасціла,
Каб волікаў накарміла.

*Дзеці співаюць пад музыку*

**Вядучая.** З надыходам вясны бягуць ручайкі, у народзе кажуць: "На Саракі пайшоў снег да ракі". Свята Саракі прыпадае на 22 сакавіка. Гэта свята адзначаецца ў гонар 40 севайсційскіх воінаў, якія былі пакараны смерцю за сваё хрысціянскае паходжанне.

Вясной дзеці часта майструюць караблікі, пускаюць іх у ручэй і назіраюць за тым, чый караблік хутчэй даплыве да вызначанага месца.

**Гульня 2. "Караблікі"**

**Вядучая.** Для наступнай гульні неабходна па адным чалавеку з кожнай каманды. Яны будуць выконваць ролю ручайка. Ім даецца па дзве шклянкі, з дапамогай якіх яны будуць пераліваць ваду з адной шклянкі ў другую, тым самым імітуючы шум вады, а астатнія, седзячы на сваіх месцах, будуць паднімаць па чарзе рукі ўгору з караблікам, потым апускаць іх ўніз і перадаваць суседу, які сядзіць побач. Гэта будуць хвалі, па якіх паплывуць нашы караблікі.

*Дзеці выконваюць дзеянні пад музыку.*

**Гульня 3. "Хто хутчэй!"**

**Вядучая.** А зараз мы паспрабуем адамкнуць зямлю-матухну ад зімовага сну. А для гэтага нам неабходна вызначыць, хто хутчэй пераломіць 40 галінак і хто хутчэй перарве 40 нітак?

*Дзяўчынкі рвуць ніткі, а хлопчыкі ламаюць галінкі.*

**Гульня 4. “Арэлі”**

**Вядучая.** Любімым заняткам дзяцей у сялянскіх сем’ях вясной было гушканне на арэлях. У нас з вамі будуць імправізаваныя арэлі – добра вам вядомыя скакалкі. І будзеце вы не гушкацца, а скакаць. Выбірайце двух прадстаўнікоў ад каманды, якія будуць спаборнічаць. На скачкі даецца 30 секунд, колькасць скачкоў суміруецца. Выйграе тая каманда, якая набрала большую колькасць.

**Гульня 5. “Жавароначкі”**

**Вядучая.** На Беларусі існавала павер’е: на Саракі прылятае 40 жаваронкаў, што значыла: вясна зусім блізка. А яшчэ ў народзе казалі: “Каб улетку не хварэць, трэба "жавароначкаў" з'есць”. Але ж есці трэба было не сапраўдных птушак, а тых, якіх выпякалі менавіта напярэдадні свята. Вось і зараз прапаную вам пабыць у ролі нашых продкаў і паспрабаваць з’есці “жаваронкаў”.

*З кожнай каманды выбіраюцца па 2 прадстаўнікі. Ім прапануецца з’есці 8 спечаных “жаваронкаў” (можна запіваць вадой).Перамагае тая каманда, якая хутчэй справіцца з заданнем.*

**Гульня 6. “Намалюй шпакоўню”**

**Вядучая.** А зараз з дапамогай лічылкі мы вызначым наступных удзельнікаў. Ім неабходна будзе намаляваць на лісце паперы шпакоўню, але … з закрытымі вачамі.

*Перамагае той, хто больш дакладна намалюе шпакоўню.*

**Гульня 7. “Ледзяшы”**

**Вядучая.** Працягваем нашу гульню. Ці ведаеце вы, што нашы продкі на свята Саракі ўшаноўвалі ваду, дакладней яе ўтварэнне – лядзяш? На жаль, у памяшканні ледзяшы хутка растаюць, але ў нас ёсць цукеркі-

ледзяшы (“Чупа-чупс”). Зараз з дапамогай лічылкі мы выберам з кожнай каманды таго, хто будзе ўдзельнічаць у наступнай гульні. Ім неабходна злізаць цукерку-лядзяш. Пераможа той, хто хутчэй справіцца з заданнем.

*(Прадстаўнікі каманд спаборнічаюць)*

**Вядучая.** Пакуль нашы ігракі зліжуць свае ледзяшы, мы пакатаем кола. У народзе казалі: “На Саракі павінна было пракаціцца сорак калёс па зямлі".

**Гульня 8. “Кола”**

*Каманды дзеляцца на 2 групы, становяцца насупраць на адлегласці 10 м. Кожнай камандзе прапануецца па адным абручы. Групам, якія знаходзяцца насупраць, неабходна пракатваць абруч “туды-сюды” і сачыць за тым, каб абруч не зваліўся і дакаціўся да партнёра.*

**Вядучая.** Вясной, калі з'яўляліся першыя праталінкі, малыя дзеці вельмі часта босымі нагамі скакалі па іх, каб паказаць зіме, што яны яе зусім не баяцца. Думаю, што і вы не адказаліся б ад такой забавы.

**Гульня 9. “Праталінкі”**

*На падлозе намаляваць крэйдай плямы-праталінкі. Па чарзе ўсе члены каманды скачуць па іх. Перамагае каманда, члены якой хутчэй справіліся з заданнем. У час спаборніцтва сачыць за тым, каб не было заступаў.*

**Гульня 10. “Верба, вербачка, вярба”**

**Вядучая.** Увесну адзначаецца яшчэ адно хрысціянскае свята - свята Вербнай нядзелі, якое прысвечана евангельскім падзеям - уваходу Ісуса Хрыста ў Іерусалім. У гэты дзень, які адзначаецца за тыдзень да прыходу Пасхі, вербачкі неслі ў царкву, каб там іх асвяціць. Вярба

вясной квітнела адной з першых сярод дрэў. Мабыць, таму ёй надавалі магічныя якасці. У народзе існуе павер'е, што калі пабіць адзін аднаго асвенчанай галінкай вярбы, то цэлы год будзеш здаровы. Пры гэтым прыгаворвалі: "Будзь вялікі, як вярба! Будзь здаровы, як вада! А багаты, як зямля!"

*Памочніцы раздаюць членам каманд вербачкі.*

**Вядучая.** Мы раздалі вам вербачкі, якімі вы будзеце адзін аднаго "біць" і прыгаворваць: "Верба-хлёст, б'е да слез". Але біць і плакаць мы будзем не па-сапраўднаму. Тая каманда, якая будзе мацней" біць" і "плакаць", перамагае.

*Неабходна сачыць за тым, каб дзеці не білі адзін аднаго моцна, прытрымліваліся правілаў.*

**Вядучая.** Вясна вельмі багатая на святы. Вось яшчэ адно вясенняе свята – Дабравешчанне, або Благавешчанне, якое адзначаецца 7 красавіка. У народзе казалі: "На Благавешчанне дзеўка касу не пляце, птушка гнязда не ўе, курыца яйкі не нясе".

Свята Благавешчанне прыйшло ў наш край з прыняццем хрысціянства. Па хрысціянскай міфалогіі ў гэты дзень архангел Гаўрыіл паведаміў Дзеве Марыі пра яе непарочнае зачацце і тое, што яна павінна нарадзіць Сына Усявышняга - Ісуса Хрыста.

Да гэтага часу з зямлі сыходзіў снег, і можна было прыступаць да веснавых работ. З прыходам Дабравешчання вясну на Беларусі пачыналі гукаць паўсюдна.

**Гульня 11. "Гуканне вясны"**

Камандам раздаецца тэкст заклічкі. Адводзіцца 2-3 хвіліны на тое, каб навучыцца добра вымаўляць заклічку. Па чарзе кожная каманда ў

поўным саставе чытае. Перамагае тая каманда, у якой атрымалася лепш, выразней, гучней.

*Дабравешчаніка святое,*
*Пашлі сонейка залатое,*
*Каб зямелька адышла*
*Ды вясна да нас прыйшла,*
*Каб распусціліся ветачкі,*
*Каб раскраснеліся кветачкі,*
*Каб лугі зазелянеліся,*
*Нашы нівачкі адзеліся.*

**Вядучая.** Свята Вялічка - з красным яечкам. Калі бывае гэта свята?..Правільна, на Пасху або Вялікдзень .А што гэта за свята?

У жыцці нашых продкаў-язычнікаў Вялікдзень адзначаўся ў гонар Бога Сонца (Дажбога), а хрысціянская назва свята – Вялікдзень. Згодна хрысціянскай міфалогіі, у пятніцу іудзеі асудзілі Сына Божага на смерць праз распяцце яго на крыжы.У суботу цела Іісуса Хрыста было перанесена ў пячору і завалена вялізным каменем. А ў нядзелю, калі Маці Божая са сваімі сяброўкамі прыйшла, каб апрануць свайго сына-нябожчыка ў пасмяротнае адзенне, то Анёл у белым адзенні абвясціў ёй і жанчынам, што Іісус Хрыстос уваскрэс.

Напярэдадні гэтага свята да чацвяргу, які называюць "чысты чацвер", старанна прыбіраліся ў хаце, мылі падлогу, вокны, бялілі ці абклейвалі шпалерамі хату, мыліся ў лазні. А ў суботу зранку завешвалі на вокны новыя фіранкі, набожнікі, замешвалі ў дзяжы цеста на пірагі, фарбавалі яйкі.

**Гульня 12. “Чыстая хата”**

*На гульню адводзіцца 30 секунд. У кожнай камандзе неабходна сабраць як мага больш непатрэбных рэчаў: паперкі, заколкі, гузікі і г.д. Тая каманда, якая збярэ больш “смецця”, перамагае.*

**Гульня 13. “Роспіс яек”**

**Вядучая.** Напэўна вы ўсе ведаеце, што на Вялікдзень прынята фарбаваць яйкі. Але некаторыя людзі не проста іх фарбуюць, але яшчэ і распісваюць. Прапаную вам на некалькі хвілін ператварыцца ў мастакоў.

*Камандам раздаецца па 5 паветраных шароў, маркеры. Неабходна нанесці малюнак на шары за 1 мінуту. Шарык і маркер перадаецца ад аднаго члена каманды да другога. Перамагае тая каманда, у якой будзе больш размаляваных шароў, малюнкі больш арыгінальныя.*

**Вядучая.** Любімым заняткам у дзяцей на Вялікдзень была гульня “Біткі”, сутнасць якой заключалася ў тым, каб высветліць шляхам біцця яек адно аб адно, чыё яйка самае моцнае.

**Гульня 14. "Біткі"**

*Члены дзвюх каманд становяцца насупраць адзін аднаго, ім раздаюцца паветраныя шарыкі. Фарміруюцца пары з членаў розных каманд, якім неабходна лопнуць шарык праціўніка толькі з дапамогай надаўлівання сваім шаром. Перамагае каманда, якая лопне больш шароў. Можна задаць пэўны прамежак часу.*

**Вядучая.** “Юр'е на двары - кароўку ў поле гані”. Вось і яшчэ адно веснавое свята мы сёння ўспомнім – Юр’я (Юр’еў дзень), які адзначаецца 6 мая. Карані гэтага свята паходзяць з язычніцтва: хрысціянскаму вобразу Святога Юрыя адпавядаў Бог Велас - ахоўнік

дамашняй жывёлы і дабрадзей у хатняй гаспадарцы, а таксама Ярыла, сын Лады і Дажбога, апякун урадлівасці і закаханых.

У гісторыі імя святога Юрыя рэальнае - гэта рымскі афіцэр, які быў пакараны смерцю за прыхільнасць да хрысціянскіх ідэй і іх прапаганду, за што быў кананізаваны новай рэлігіяй як вялікамучанік за яе святую справу .

Воіну Юрыю-вялікамучаніку надавалася значэнне абаронцы ад розных "нячысцікаў", вызваліцеля палонных і заступніка войска. На многіх абразах ён намаляваны ў выглядзе воіна з кап'ём, вастрыём якога прыціскае да зямлі лютага змея.

Дык вось на Юр'я звычайна выганялі ў поле жывёлу. А каб карова не баялася "суроку і розных гадаў", на выхадзе з хлева клалі пілу зубамі да парога або крапіву. У двары тройчы абыходзілі "кароўку" са свечкай, хлебам-соллю і чырвоным яйкам, асвечаным на Вялікдзень. Выганялі "кароўку" са двара абавязкова галінкаю вярбы, якую асвячалі ў царкве або касцёле ў Вербную нядзелю. У варотах на выхадзе на вуліцу таксама клалі замок ці сякеру, хлеб, соль і велікоднае яйка, праз якія жывёла павінна была перайсці не перадам, а задам.

**Гульня 15. "Кароўкі"**

*Для гульні на падлозе раскладаюцца розныя прадметы (кубікі, мячы і г.д.), якія неабходна пераступаць. Каманды становяцца па 5 чалавек у ланцужок. Пачынаюць рухацца спінай наперад, пераступаючы розныя прадметы у абодва бакі. Перамагае тая каманда, якая хутчэй закончыць гульню.*

**Вядучая.** Ну вось мы з вамі і пагулялі. Журы вызначыць, якая каманда перамагла. Але самае галоўнае, што мы з вамі сёння зрабілі, - наблізілі надыход вясны. Давайце паклічам Вясну.

*Усе разам клічуць:"Прыйдзі,вясна! Прыйдзі,красна!"*

*З'яўляецца дзяўчына-Вясна, а з ёй дзяўчынкі-вяснянкі, якія трымаюць на падносах прызы.*

**Вядучая.** Вясна,вясна!

Што ты нам прынясла?

**Вясна.** Я вам прынясла

Тры карысці ў радасці,

Шаўковую траву на вясну,

Буйнае жыта на лета,

Ядрынку-грэчку на восень.

А яшчэ падарункі і пачастункі ўсім удзельнікам гульні, хто так добра змагаўся і хваляваўся за тое, каб вясна хутчэй прыйшла. Вялікі дзякуй усім!

**Вядучая.** Мы з вамі развітваемся.

Будзьце здаровы, як крынічная вада!

Будзьце вясёлы, як добрая вясна!

Будзьце багаты, як наша зямля!

Да пабачэння, да новых сустрэч!

**Заўвага.** На працягу ўсіх гульняў гучыць бадзерая, вясёлая музыка.